Хрытанькоў М.

# ПОДЗВІГ НА ЗЯМЛІ БРАТНЯЙ ВЕНГРЫІ

У лютым пераможнага сорак пятага радасная вестка прыйшла ў вёску Царковішча былога Сліжоўскага сельсавета. Камандаванне аднаго з воінскіх падраздзяленняў дзеючай Савецкай Арміі шчыра віншавала Сцяпана Васільевіча і Маланню Сямёнаўну Мілюціных з прысваеннем іх сыну Андрэю высокага звання Героя Савецкага Саюза. На жаль, уручыць гэта віншаванне не было каму. Бацькі Андрэя не вытрымалі здзекаў фашыстаў і памерлі, не дачакаўшыся сваіх вызваліцеляў.

А бітва з фашызмам працягвалася. Кароткія Андрэевы франтавыя весткі чыталі ўсёй вёскай. "Дабіваем апошніх гітлераўцаў... Учора разграмілі групоўку эсэсаўцаў-галаварэзаў... Да хуткага спаткання, зямлякі".

"Хуткае" спатканне адбылося толькі праз два гады пасля Перамогі. На сустрэчу з Героем прыйшлі былыя салдаты і ўдовы салдацкія, зведаўшыя жахі вайны, старыя і дзеці не толькі з Царковішча, Акунёўкі і Гарадца, але і з больш аддаленых вёсак Гарадзішчанскага, Фашчаўскага, Княжыцкага сельсаветаў. Такія сустрэчы са слязамі радасці бываюць не так часта. Затое запамінаюцца на ўсё жыццё. Запомніў яе і Андрэй Сцяпанавіч.

Ён, ветэран вайны і працы, персанальны пенсіянер і сёння помніць сваю баявую споведзь перад землякамі, знаёмымі і незнаёмымі.

...У чэрвені перадваеннага 1940 года пасля заканчэння Княжыцкай сямігодкі Андрэй паехаў у далёкую ад роднай Беларусі Кіраўскую вобласць. Марыў паступіць у школу ФЗН, але па нейкіх прычынах не змог. Уладкаваўся простым рабочым. – будаўніком на станцыі Зуеўка. На важны аб'ект пракладваў хлопец чыгунку. Зведаў бытавыя нястачы, нязносныя камарыныя блакады.

Пра напад фашысцкіх цемрашалаў на нашу Радзіму даведаўся ад камісара атрада будаўнікоў Сяргея Цімаховіча. Адным з першых Андрэй выступіў на мітынгу і папрасіўся на фронт.

– Прыйдзецца пачакаць. Работа ў нас адказная, абароннага значэння, – сказаў камісар. – Ды і ўзрост яшчэ не падышоў...

Чакаць давялося больш года. Толькі ў кастрычніку 1942-га Андрэю і яго сябрам-шклаўчанам Мікалаю Жэлязоўскаму, Івану Сенакосаву, Мікалаю Тамашэвічу ўручылі позвы. На размеркавальным пункце некаторых будучых воінаў накіравалі пад Сталінград, іншых на прарыў блакады гераічнага Ленінграда. Андрэя Мілюціна, пасля заканчэння палкавой школы, прызначылі камандзірам кулямётнага разліку 1409

зенітнага артылерыйскага палка Чаркаскай дывізіі. Тут і пачаўся адлік яго баявых вёрстаў.

Вызваленне Украіны, братніх народаў Румыніі і Югаславіі. У канцы снежня 1944 года войскі Другога Украінскага фронту, у састаў якога ўваходзіла дывізія, дзе ваяваў Андрэй Мілюцін, перайшла граніцу Венгрыі. За гэты час Андрэй стаў камандзірам стралковага ўзвода, лейтэнантам. За баі пад Уманню яго ўнагародзілі ордэнам Чырвонай Зоркі.

...Баі ў прыгарадзе Будапешта не змаўкалі ні на мінуту. Вакол бухала і грымела, над горадам віселі хмары дыму. Байцы роты старшага лейтэнанта Васіля Гардзіенкі ў саставе палка штурмавалі абарону праціўніка.

Смяротныя баі за кожны дом, паверх, лесвічную кдетку, за кожную вуліцу складанага лабірынту незнаёмага горада. Рота атрымала новую баявую задачу – высунуцца да палатна чыгункі, якая звязвала Буду і Пешт, перш рэзаць важную камунікацыю праціўніка, скаваць і ўскладніць становішча фашыстаў.

Старшы лейтэнант Гардзіенка выслаў разведку. Прайшоў назначаны тэрмін, а байцы не вярталіся.

– Лейтэнант Мілюцін, – загадаў маладому афіцэру камандзір роты. – Прабівайцеся са ўзводам да чыгункі, займіце там абарону і адбівайце контратакі праціўніка!

Байцы ўзвода кароткімі перабежкамі, пад кулямётным і артылерыйскім агнём набліжаліся да палатна чыгункі. Гардзіенка падняў у атаку і астатнія ўзводы сваёй роты. Камандзір быў ужо на подступах да чыгуначнага маста, але шквальны агонь прыціснуў яго да зямлі. Мілюцін з двума байцамі папоўз на выручку ротнага. Варожыя снайперы не давалі ўзняць галавы. Стралялі фашысты з царкоўнай званіцы. Лейтэнант сам залёг за кулямёт . Некалькі доўгіх чэргаў па званіцы і снайперы былі знішчаны.

Байцы паднялі Васіля Гардзіенку, але сэрца маладога камуніста ўжо не білася.

Пра смерць ротнага далажылі ў штаб палка. Адтуль паследаваў кароткі загад падпалкоўніка Адзінцова:

– Камандзірам роты прызначаю лейтэнанта Мілюціна. Баявая задача ранейшая.

Велізарная адказнасць лягла на плечы Андрэя. У крытычны момант рота згубіла вопытнага баявога камандзіра. Мілюцін добра ведаў Васіля Прохаравіча. Успомнілася, як ён, Андрэй, будучы яшчэ сяржантам, пасля цяжкага бою пад Уманню падаў заяву аб прыёме ў партыю. Старшы лейтэнант Гардзіенка адным з першых даў яму рэкамендацыю. І вось цяпер даводзіцца замяніць яго, стаць камандзірам роты.

Рыхтуючыся да адбіцця варожых контратак лейтэнант прымае рашэнне ўмацаваць флангі роты кулямётнымі разлікамі. Хутка зрабілі

невялікую перадыслакацыю. Салдаты заляглі, прыціснуліся да зямлі. Усе былі поўны рашучасці адстаяць заняты рубеж, утрымаць чыгунку.

На роту Мілюціна праціўнік абрушыў ураганны агонь артылерыі і мінамётаў. Яшчэ не кончыўся абстрэл, як фашысты пайшлі ў контратаку, абыходзячы байцоў мужнай роты справа і злева. На правым флангу застракаталі кулямёты камандзіра аддзялення старшыны Марозава. Гітлераўцы адступілі на зыходны рубеж, пакінуўшы на полі бою дзесяткі трупаў.

Спроба праціўніка дабіцца поспеху на левым флангу таксама не прынесла поспеху. Андрэй Мілюцін паўзком дабраўся да аддзялення старшыны Субоціна і сам кіраваў адбіццём контратакі. Куляметчыкі падавілі дзве агнявыя кропкі праціўніка, нанеслі ворагу вялікія страты.

Пасля непрацяглай паўзы фашысты зноў пайшлі ў контратаку па ўсёй абароне ро ты. Падтрыманыя артылерыйскім агнём, байцы Андрэя Мілюціна змагаліся з ранейшай упартасцю, касілі насядаўшых фрыцаў агнём аўтаматаў і кулямётаў, закідвалі іх гранатамі. Бясстрашна змагаўся сяржант Чарапанаў. Манеўруючы агнём кулямётаў, ён умела накіроўваў яго ў найбольш небяспечныя месцы, сам падбіў варожы бронетранспарцёр, 3 аўтамашыны. Ва ўпор расстрэльвалі насядаўшых гітлераўцаў байцы кулямётнага разліку старшыны Бязручка. Адбіваючы адну з контратак ён павёў байцоў у рукапашную і захапіў у палон дзесяць варожых салдат.

Рота Андрэя Мілюціна адстаяла рубеж, знішчыўшы 20 агнявых кропак, каля 350 фашыстаў. Гітлераўцам не ўдалося адбіць гэты ўчастак чыгункі. Удары па ворагу ўсё нарасталі – і ён вымушан быў адыходзіць. Савецкія воіны ачышчалі ад фашыстаў адзін квартал за другім, вуліцу за вуліцай. Байцы лейтэнанта наступалі ў баявых парадках палка, знішчаючы ачагі супраціўлення.

Баі былі цяжкія, кровапралітныя. Вораг аказваў упартае супраціўленне. Пад націскам савецкіх воінаў акружаны варожы гарнізон быў разбіты. Масква салютавала мужным воінам, якія вызвалілі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Будапешт – сталіцу будучай Венгерскай Народнай Рэспублікі.

За подзвігі ў гэтых баях многія воіны адзначаны высокімі ўзнагародамі Радзімы. Лейтэнанту Андрэю Сцяпанавічу Мілюціну прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Гэты кароткі расказ пра чалавека, які адзін з многіх, хто быў заўсёды на передавой, адзін з нямногіх, хто застаўся жывы, прайшоўшы страшэннае пекла вайны. Цуды і на фронце здараюцца. Праўда, не так часта, як думаюць тыя, хто пра вайну ведае па кнігах і кінафільмах.

**Хрытанькоў, М. Подзвіг на зямлі братняй Венгрыі / М. Хрытанькоў // Ударны фронт (Шклоў). — 1985. — 23 лютага. — С. 2.**